Прывіды на дарозе
*Стар. 4-5*

Газеце “Паходня” – 14 гадоў
*Стар. 6*

Ох, эти русские!
*Стар. 8*

**Выбар**

№11
ВЕРАСЕНЬ 2007

Газэта Магілёўскай абласной кааліцыі дэмакратычных сілаў

# Дзень беларускай вайсковай славы

## У СУБОТУ, ВОСЬМАГА ВЕРАСНЯ ПАТРЫЯТЫЧНАЯ ГРАМАДЗКАСЦЬ БЕЛАРУСІ І БЕЛАРУСАЎ СВЕТУ БУДЗЕ АДЗНАЧАЦЬ СЛАВУТУЮ ДАТУ БЕЛАРУСКАЙ ГІСТОРЫІ. ЧЫМ ЗНАКАМІТЫ ГЭТЫ ДЗЕНЬ? — ЧЫТАЙЦЕ ЧАРГОВЫ АРТЫКУЛ ГІСТОРЫКА.

Пасля абвяшчэння ў 1991 годзе незалежнасці Беларусі пераглядаўся спіс агульнадзяржаўных святаў. Выказваліся прапановы замест штучна замацаванага на 23 лютага “Дня Советской Армии и Военно-морского флота” увесці Дзень беларускай вайсковай славы і адзначаць яго альбо 15 ліпеня, альбо 8 верасня.

Трэба прызнаць, што ў адрозненне ад ганебных падзей савецкай гісторыі 18 лютага – 3 сакавіка 1918 года, абедзве даты з’яўляюцца ганаровымі для беларусаў.

15 ліпеня 1410 г. каля вёскі Грунвальд аб’яднанае войска беларуска-літоўскай дзяржавы Вялікага Княства Літоўскага і Каралеўства Польскага ушчэнт разрамілі Тэўтонскі ордэн і спынілі шматвекавы націск германскіх рыцараў-крыжакоў на славянства. Пра Грунвальдскую бітву можна было і ў савецкія часы прачытаць у любым падручніку па гісторыі.

А вось пра падзеі 8 верасня 1514 года ў падручніках і навуковых выданнях савецкіх часоў вы не знойдзеце нічога. Памятаю выпадак: недзе напачатку дзевяностых гадоў мне, як загадчыку кафедры гісторыі і культуралогіі БСГА, патэлефанаваў супрацоўнік рэдакцыі газеты “Ленінскі шлях” і папрасіў даць у газету матэрыял аб бітве пад Оршай (напаміны пра яе сталі з’яўляцца ў недзяржаўных выданнях).

Натуральна, я вырашыў звярнуцца да адпаведнай літаратуры. І вось што цікава: ні ў адным афіцыйным выданні па гісторыі Беларусі, а я прагледзеў іх шмат, пра гэтую бітву не было ні слова. Нават у пяцітомнай “Гісторыі Беларускай ССР”, падрыхтаванай навукоўцамі Акадэміі навук БССР. Пра ўсялякую драбязу ёсць, а пра бітву - няма.



А чаму ж нічога не пісалі? Няўжо супрацоўнікі Акадэміі не ведалі пра яе?

Канечне, ведалі. А вось пісаць было нельга. Камуністычная цэнзура пільна сачыла, каб гістарычныя публікацыі не разбуралі афіцыйны міф аб беларусах і рускіх як аб “едином народе”, “общей истории”, “вечном братстве” і гэтак далей. Усё, што не ўпісвалася ў такі падыход, павінна было застацца невядомым для будучых пакаленняў.

Каб лепш зразумець дзень 8 верасня 1514 года, трэба коратка нагадаць гісторыю стасункаў беларуска-літоўскай дзяржавы Вялікага Княства Літоўскага і Маскоўскага вялікага княствам у папярэднія гады.

У XIII – першай палове XV стагоддзя Масква, занятая праблемай вызвалення ад татара-мангольскага ярма і разборкамі з бліжэйшымі суседзямі, не ўяўляла значнай пагрозы для ВКЛ. Аднак пасля 1480 года, калі панаванне татараў скончылася, маскоўскія князі пачынаюць націск на ўсход.

Для апраўдання агрэсіі яны выкарыстоўваюць фальшывы тэзіс, што “земли Малой и Белой Руси – наша отчина и нам нашей отчины жаль” (“отчина” – ад стараславянскага “отчич” – бацька). Інакш кажучы, маскоўскія князі нахабна аб’яўлялі сучасныя ўкраінскія і беларускія землі сваёй бацькаўшчынай. Так пачыналася вялікая гістарычная хлусня, бо калі ў XI ст. існавалі Полацкае і Кіеўскія княствы пра Маскву яшчэ і пеўні не пелі (яна была заснавана ў 1147 г.).

Канец XV – пачатак XVI ст. насычаны амаль бесперапыннымі войнамі паміж Маскоўскім княствам і ВКЛ. У 1512, 1513 і 1514 гг. маскоўскія войскі тройчы спрабавалі захапіць беларускі горад-крэпасць на ўсходзе Смаленск. У канцы ліпеня ім гэта ўдалося і 80-тысячнае войска маскоўцаў пачало прасоўвацца ў напрамку Орша і далей на Вільню.

*Працяг на стар. 2*

№11 ВЕРАСЕНЬ 2007 Выбар
Газэта Магілёўскай абласной кааліцыі дэмакратычных сілаў

# Дзень беларускай вайсковай славы

*Пачатак на стар. 1*

Насустрач з Мінска і Барысава выступіла 30 тысячнае беларускае войска (з улікам 3 тысячаў польскіх рыцараў). Камандаваў войскам гетман найвышэйшы (як цяпер – міністр абароны) ВКЛ беларус Канстанцін Іванавіч Астрожскі. Сярод камандзіраў былі Юры Радзівіл з Горадні, Юры Алелькавіч са Слуцка, Іван Сапега з Трокаў.

Напрыканцы жніўня адбыліся першыя сутычкі беларускага войска з перадавымі палкамі маскоўцаў. Апошнія пацярпелі некалькі паражэнняў. Тады галоўны ваявода маскоўскага войска Іван Чаляднін адвёў свае палкі за Днепр і выбраў месца для галоўнай бітвы. На вялікім полі паміж Оршай і Дуброўнай ля ракі Крапіўна, каля вёсак Пугайлава і Рукліна, размясціліся маскоўскія палкі.

Войска ВКЛ падышло да Дняпра 7 верасня і ў ноч на 8 верасня змагло пераправіцца на левы бераг і таксама заняць пазіцыі.

Не будзем стамляць чытача апісаннем баявога размяшчэння аддзелаў і харугваў (аддзелы – асобныя часці; харугвы – асноўныя ваенна-тактычныя адзінкі, кожная выступала па сваім сцягам – харугваю, адсюль і адпаведная назва). Важна тое, што Канстанцін Астрожскі разлічваў не на колькасць свайго войска, а на яго якасць. У яго разліках асноўную ролю павінны былі адыграць манеўраныя часці (харугвы цяжкай і лёгкай кавалерыі) і агнястрэльнае ўзбраенне – найперш гарматы, якіх не было ў маскоўскім войску, а таксама стрэльбы і пішчалі.

Войска выступала пад дзяржаўным сцягам чырвонага колеру са срэбнай выявай герба Пагоня на адным баку і Багародзіцы з маленькім Ісусам – на другім. Кожны з беларускіх вершнікаў трымаў дзіду (капьё) з маленькім сцяжком-вымпелам белага колеру з чырвонымі палоскамі. Даследчыкі лічаць, што гэтыя сцяжкі – прадвеснікі нашага гістарычнага нацыянальнага бела-чырвонага-белага сцяга.

У пятніцу 8 верасня 1514 года раніцою перад пастаўленымі ў баявыя парадкі войскамі праваслаўныя святары і ксяндзы адслужылі малебен (у маскоўскім войску таксама) і праз некаторы час атакай маскоўска палка кавалерыі пачалася бітва.

Колькасная перавага амаль у тры разы маскоўскага войска над беларускім войскам давала ўпэўненасць ваяводам у непазбежнай перамозе. Але Канстанцін Астрожскі супрацьпаставіў колькасці вайсковае майстэрства і дакладны разлік. Усе атакі непрыяцеля былі адбіты. У пэўны момант частка беларускай конніцы заманіла маскоўскіх вершнікаў у засаду пад знішчальны агонь гармат і ўзброеных рушніцамі пехацінцаў і гэта стала пераломам у бітве. У шэрагах маскоўскага войска пачалася паніка, замест адступлення пачаліся бязладныя ўцёкі з вялікімі стратамі.

Сама бітва цягнулася каля трох гадзін, а праследаванне і знішчэнне захопнікаў працягвалася да вечара.

Сучаснікі бітвы і больш позния аўтары пакінулі шматлікія апісанні гераічнай перамогі беларускага войска і адначасова трагедыі маскоўскага войска. Прывядзем словы расійскага гісторыка С.М. Салаўёва. У сваёй "Истории государства Российского" ён адзначыў страшэнную паразу маскоўскага войска: "...усе ваяводы трапілі ў палон, не кажучы ўжо аб вялікай колькасці забітых ратнікаў; рака Крапіўна (паміж Оршай і Дуброўнай) напоўнілася целамі маскавіцянаў, якія ва ўцёках кідаліся з яе стромкіх берагоў".

Па падліках даследчыкаў, з маскоўскага боку колькасць забітых на полі бою і падчас праследавання ўцекачоў склала каля 40 тысяч чалавек, палоннымі – звыш 5 тысяч. У палон трапілі ўсе ваяводы, былі ўзяты велізарныя трафеі, усе маскоўскія сцягі і ўся агнястрэльная зброя.

Аб перамозе пад Оршай стала вядома ўсім манархам Еўропы. Адмысловыя паведамленні з апісаннем бітвы былі надрукаваны ў 1514 і 1515 гг. у Нюрнбергу, уключаны ў шматлікія летапісы і хронікі, знайшлі адлюстраванне ў беларускай народнай творчасці.

Бітва пад Оршай вывучалася як узор баявога майстэрства ў шэрагу краінаў сярэднявечнай Еўропы і вайсковых вучэльнай дарэвалюцыйнай Расіі, прыведзена ў Расійскай ваеннай энцыклапедыі 1914 г.

Але галоўнае, што гэтая бітва з'яўляецца славутай старонкай беларускай вайсковай гісторыі, прыкладам мужнасці і майстэрства нашых продкаў у абароне незалежнасці сваёй Айчыны. Яна абвяргае ўяўленне аб спрадвечнай пакорлівасці, так званай талерантнасці беларусаў, якую так назойліва імкнуліся (ды і зараз імкнуцца) прывіць няпрошаныя дабразычліўцы. І, магчыма, звесткі пра гэтую бітву натхнілі славутыя радкі Максіма Багдановіча:

*Толькі ў сэрцы трывожным пачую*
*За краіну радзімую жах –*
*Ўспомню Вострую Браму святую*
*І ваякаў на грозных канях.*
*Ўсё лятуць і лятуць тыя коні,*
*Срэбнай збруяй далёка грымяць...*
*Старадаўняй Літоўскай Пагоні*
*Не разбіць, не спыніць, не стрымаць.*

Аўтарам выкарыстаны публікацыі беларускіх гісторыкаў А.Грыцкевіча, Г.Сагановіча і іншых.

***А. Каданчык,***
***кандыдат гістарычных навук***

РАДЫЁ СВАБОДА

## МАГІЛЁЎСКІЯ ПАЖАРНЫЯ ПАКАРАЛІ АКТЫВІСТА ЗА ДЗЕНЬ ВАЙСКОВАЙ СЛАВЫ

КАМІСІЯ МАГІЛЁЎСКАГА РАЁННАГА АДДЗЕЛУ НАДЗВЫЧАЙНЫХ СЫТУАЦЫЯЎ ДАЛА ПАПЯРЭДЖАНЬНЕ КІРАЎНІКУ ГАРАДЗКОЙ АРГАНІЗАЦЫІ ТАВАРЫСТВА БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ АЛЕГУ ДЗЯЧКОВУ ЗА ПАРУШЭНЬНЕ ПРАВІЛАЎ ПАЖАРНАЙ БЯСЬПЕКІ Ў ЛЕСЕ.

Пажарныя зьвінавацілі спадара Дзячкова ў тым, што ён расклаў вогнішча.

Алега Дзячкова, разам з дваццацьцю актывістамі, затрымалі 8 верасня ў Любускім лесапарку Магілёва міліцыянты з роты хуткага рэагаваньня.

У лесапарку актывісты адзначалі Дзень беларускай вайсковай славы. У Кастрычніцкі аддзел міліцыі, куды даставілі актывістаў, тэрмінова выклікалі інспэктара з раённага аддзелу Міністэрства надзвычайных сытуацыяў, які склаў праtакол аб адміністрацыйным правапарушэньні.

У Магілёве Алег Дзячкоў ня першы, каго караюць пажарныя.

4 верасня на 155 тысяч рублёў аштрафавалі Зьмітра Салаўёва. Камісія зьвінаваціла яго ў парушэньні правілаў пажарнай бясьпекі ў лесе.

## АКТЫВІСТАЎ ПРЫМУСІЛІ СЫСЬЦІ ЗЬ ЦЯГНІКА "МАГІЛЁЎ-ВОРША"

Грамадзкіх актывістаў з Магілёва, якія зьбіраліся выправіцца на фэст беларускай аўтарскай песьні і паэзіі "Аршанская бтва-2007", міліцыянты беларускай чыгункі змусілі сысьці зь цягніка "Магілёў-Ворша" і прайсьці ў пастарунак чыгуначнага вакзалу Магілёва.

Сярод затрыманых – кіраўнік гарадзкой суполкі Таварыства беларускай мовы Алег Дзячкоў, моладзевыя актывісты Яўген Бойка і Яўген Сувораў. Дакладная колькасьць затрыманых пакуль невядомая.

У пастарунку міліцыянты правялі агляд асабістых рэчаў актывістаў. Прычынаў затрыманьня міліцыянты не называюць.

Тым часам затрыманых у Магілёве на чыгуначным вакзале грамадзкіх актывістаў, якіх міліцыянты прымусілі сысьці зь цягніка "Магілёў – Ворша", адпусьцілі з пастарунку, дзе яны правялі каля дзьвюх гадзін. Міліцыянты агледзелі іх асабістыя рэчы і спраўдзілі пашпартныя дадзеныя. Затрыманьне міліцыянты патлумачылі тым, што маладыя людзі нібыта падобныя да наркакур'ераў. Цяпер актывісты едуць цягніком да Воршы.

*Любоў Лунёва*

## У ВОРШЫ ЗАТРЫМАНЫЯ АКТЫВІСТЫ З ГОРАК

Мікрааўтобус, якім ехалі актывісты на фэст беларускай аўтарскай песьні і паэзіі "Аршанская бітва-2007", міліцыянты спынілі нібыта для праверкі дакумэнтаў кіроўцы. Затым на гэтай жа машыне актывістаў даставілі ў пастарунак.

Адна з затрыманых, Ірына Каралькова, паведаміла "Свабодзе", што міліцыянты ў кожнага правяраюць пашпарты ды праводзяць прафіляктычную гутарку. Асноўнае пытаньне – куды едзеце і навошта.

*Радыё Свабода*

## У ВОРШЫ ЗАТРЫМАЛІ 9 МАЛАДАФРОНТАЎЦАЎ І АЛЕСЯ ПУШКІНА

Супрацоўнікі міліцыі затрымалі дзевяцёх актывістаў незарэгістраванай арганізацыі "Малады фронт", як толькі яны ад'ехалі ад Аршанскага вакзала ў бок Крапівенскага поля.

Маладафронтаўцаў завялі ў пастарунак міліцыі, патлумачыўшы ім, што трэба высьветліць іхныя асобы.

Мастака Алеся Пушкіна супрацоўнікі Дзяржаўтаінспэкцыі затрымалі на падыходах да поля беларускай вайсковай славы. Мастак пачаў іграць на гітары і сьпяваць на дарозе, на тым месцы, дзе яго спынілі міліцыянты, і сабраў такім чынам натоўп людзей.

На месцы імпрэзы ўжо сабраліся некалькі дзесяткаў чалавек. Павал Севярынец апавёў, што блізу Крапівеньскага поля заўважаныя кіраўнікі Віцебскай гарадзкой і абласной міліцыі.

## НА КРАПІВЕНСКІМ ПОЛІ АРЫШТАВАНА КАЛЯ 40 ЧАЛАВЕК

Сярод затрыманых – Дзяніс Садоўскі, сакратар аргкамітэту па стварэньні "Беларускай хрысьціянскай дэмакратыі". Яго павезьлі ў шпіталь. Міліцыянты абвінавачваюць хлопца ў супраціве і непадпарадкаваньні міліцыянтам. Разам зь Дзянісам знаходзіцца міліцыянт, які сьцьвярджае, што Дзяніс нібыта падрапаў яму руку.

У міліцэйскім аўтобусе знаходзяцца Андрэй Шарэнда, кіраўнік Берасьцейскай філіі "Маладога фронту", менскія актывісты Алена Макарэвіч, Кацярына Краснова, Кацярына Галіцкая, Зьміцер Хведарук, Натальля Старасьціна, аршанскія актывісты.

На вакзале шмат міліцыі. Затрыманыя актывісты "Маладога фронту" з Жодзіна, сярод якіх – Павал Красоўскі. Міліцыянты сустракаюць цягнікі з Магілёва, Гомеля і Віцебску, у якіх на імпрэзу едуць некалькі дзесяткаў моладзевых актывістаў.

Наша карэспандэнтка перадае зь месца падзеяў:

Станкевіч: "Я знаходжуся цяпер каля вёскі Гацькаўшчына, у 300 мэтрах ад Крапівенскага поля, дзе сёньня ў 17-ы раз мусіў адбыцца бардаўскі фэст "Аршанская бітва". Месца правядзеньня фэсту заблякаваная міліцыяй, перакрытае міліцэйскімі машынамі.

Людзі ўсё адно зьбіраюцца і гуртуюцца невялікім групамі. Тых, хто прыехаў зь нейкім транспартам, затрымліваюць, затрымалі ўжо каля 40 чалавек. У Аршанскім райаддзеле міліцыі – Алесь Пушкін, а ў Дубровенскім – Юры Копцік, адзін з заснавальнікаў традыцыі правядзеньня фэсту. Пэрспэктывы няясныя, афіцыйны пачатак – а 20-й вечара, і, магчыма, актывісты знойдуць месца, дзе сабрацца, і фэст усё-ткі пройдзе".

Супрацоўнікі міліцыі займаюцца пошукам выбуховых прыстасаваньняў на Крапівенскім полі зь вечара 7 верасьня. "З учарашняга вечара тут знаходзяцца міліцэйскія пасты, на месца правядзеньня фэстывалю не прапускаюць ні транспарт, ні людзей. Як нам патлумачылі, у Дняпры, у тым месцы, дзе ў яго ўпадае рэчка Крапівенка, шукаюць нейкія міны або снарады", – сказаў адзін з арганізатараў фэстывалю, аршанскі краязнаўца Юры Копцік.

*Радыё Свабода*

## ФЭСТ "АРШАНСКАЯ БІТВА-2007" АДБЫЎСЯ, НЯГЛЕДЗЯЧЫ НА МАСАВЫЯ ЗАТРЫМАНЬНІ

Сёньня зранку і ўчора ўвечары міліцыянты затрымалі каля ста чалавек, якія меліся ўзяць удзел у нефармальнай імпрэзе. Аднак яшчэ каля дзьвюх соцень аматараў беларускай бардаўскай песьні здолелі ўнікнуць затрыманьняў і сабрацца ў навакольлі вёскі Гацькаўшчына Аршанскага раёну.

Міліцыянты пільнавалі ўдзельнікаў бардаўскага фэсту яшчэ ад учорашняга ранку. Каля 20 чалавек затрымалі ў Воршы ці на выезьдзе з гораду. Ня менш як 60 чалавек трапілі ў аршанскі райаддзел міліцыі з аўтобуснага прыпынку ў вёсцы Гацькаўшчына. Пад'езд да вёскі быў блякаваны міліцэйскімі машынамі, і ўсіх, хто падаваўся міліцыянтам падазронымі асобамі, звозілі ў пастарунак.

Радыё Свабода

## ВОРША: ДЗЯНІСА САДОЎСКАГА ПАКАРАЛІ 5 СУТКАМІ АРЫШТУ

Аршанскі суд пакараў сакратара аргкамітэту ў стварэньні "Беларускай хрысьціянскай дэмакратыі" Дзяніса Садоўскага арыштам на 5 сутак. Дзяніса Садоўскага затрымалі 8 жніўня каля Крапівенскага поля, куды прыехалі моладзевыя актывісты адзначыць Дзень беларускай вайсковай славы.

Затрыманага Дзяніса Садоўскага міліцыянты адвезьлі ў шпіталь, адзін з іх сьцьвярджаў, што Дзяніс нібыта аказаў супраціў і падрапаў яму руку. Міліцыянты патрабавалі, каб Дзяніса праверылі на ўжываньне алькаголю.

Сёньня аршанскі суд пагадзіўся з абвінавачаньнямі міліцыянтаў у дробным хуліганстве і пакараў Дзяніса арыштам на 5 сутак.

*Любоў Лунёва*

№11 ВЕРАСЕНЬ 2007 Выбар
Газэта Магілёўскай абласной кааліцыі дэмакратычных сілаў

"ПАДЫМАЮЦЦА З МАГІЛАЎ АБЛЕЗЛЫЯ ЦЕНІ..."
*Віктар ШАЛКЕВІЧ*

# Прывіды на дарозе

## ЛЮДЗІ, ЯКІЯ ЛІЧАЦЬ СЯБЕ АФІЦЭРАМІ, РАБІЛІ ЎСЁ, КАБ САРВАЦЬ СЬВЯТКАВАНЬНЕ ДНЯ БЕЛАРУСКАЙ ВАЙСКОВАЙ СЛАВЫ

У мінулую суботу больш за трыццаць жыхароў Горак рушылі ў бок Воршы, дзе на Крапівеньскім полі павінна было адбыцца сьвяткаваньне чарговых угодкаў перамогі беларускага войска над маскоўскімі інтэрвэнтамі. І хаця арганізавала гэтую паездку мясцовая Кааліцыя дэмакратычных сілаў, нельга казаць, што мэтай яе была нейкая палітычная акцыя. У дарогу запрасілі ўсіх, каму гэтае сьвята было цікавае.

Людзі зьбіраліся ў добрым настроі, спадзяючыся паглядзець канцэртную праграму (а мо хто й сам хацеў нешта сьпець, альбо расказаць са сцэны), некаторыя ехалі сем'ямі, было нямала дзяцей. Добрыя клумкі ў руках амаль кожнага, хто сабраўся ў даргогу, сьведчылі аб намеры грунтоўна павячэраць на сьвежым восеньскім паветры ля вогнішча ў кампаніі аднадумцаў, завесьці новыя знаемствы, паразмаўляць на роднай мове, не чакаючы, што калі яе хтосьці пачуе, то пачне па-дізкунскую азірацца ды ўсьміхацца. Той-сёй зьбіраўся перакуліць і чарку-другую, ушанаваўшы памяць гэтмана Канстанціна Астрожскага ды ягоных ваяроў, якія восьмага верасьня 1514 года абаранілі сваю краіну ад варожага нашэсьця. Да таго ж, сьвяту спрыяла нядрэннае восеьскае надвор'е...

...Калі пасьля павароту ў бок Дуброўны на дарозе стаў бачны даволі шматлікі натоўп, то адразу падумалася, што гэта нейкія здані зь мінулага. Здавалася што фантомы маскоўскга войска зноў стаяць на Крапівеньскім полі, а ахоўныя кардоны паўстаўшых з таго сьвету жудасных прывідаў і цяпер сьцерагуць даргоу, каб не дазволіць прайсьці туды гаспадарам гэтай зямлі - беларусам. Хоць і ня надта веру ў Бога, але ўзьнікла жаданьне перахрысьціцца. Ды не пасьпеў: машына пад'ехала бліжэй і стала ясна, што супраць ГЭТЫХ аніякі Сьвяты крыж не дапаможа – з двох бакоў аўтатрасы стаялі нарады міліцыі.

Канешне, ахова грамадзкага парадку – рэч на такіх мерапрыемствах неабходная. І калі б у супрацоўнікаў Аршанскага гараддзелу ўзьнікла такое жаданьне, то яно магло быць толькі ўхваленае. Але тым зараз было не да парадку. На падставе ўбачанага уласнымі вачыма, бяруся сцьвярджаць, што людзі, якія лічаць сябе АФІЦЭРАМІ, мелі мэтаю якраз-такі адваротнае. Яны павінныя былі ўнесьці дэзарганізацыю ў рады сьвяткуючых і у рэшце рэшт – САРВАЦЬ У КРАІНЕ СЬВЯТКАВАНЬНЕ ДНЯ ВАЙСКОВАЙ СЛАВЫ. Як напісаў калісьці нехта з расейскіх літаратурных клясыкаў, "Тащить и не пущать".

Дарэчы, кардонаў на падыходзе да поля было некалькі. На першым зь іх "шманалі" толькі аўтобусы. Нашыя чатыры легкавікі праехалі далей. Горацкі ж бус, які рухаўся сьледам за намі, затрымалі і бяз аніякіх тлумачэньнняў адправілі ў Воршу, у гараддзел, нешта там высьвятляць. Як праходзіла "высьвятленьне", вы можаце даведацца с матар'ялаў незалежных медыяў, якія мы друкуем побач, а таксама са сьведчаньняў тых, хто ехаў у мікрааўтобусе. Мэтаю, як бачна, было адно – пацягнуць час, каб не пусьціць людзей на сьвята. Ніякіх абвінавачваньняў ў аддзеле нашым землякам прад'яўлена не было (ды й што прад'яўляць?), на бессэнсоўныя пытаньні, кшталту "адкуль-куды-навошта" ўсе адказвалі шчыра, не разумеючы, чаго тут ад іх ўвогуле хочуць.

Тыя, хто здолеў праехаць-такі да павароту на веску Гацькаўшчына (побач з Крапіўнай, па гэтай дарозе й трэба ехаць да славутага поля) наткнуліся там на шматлікі нарад зь людзей у пагонах з зоркамі. Не хачу называць іх афіцэрамі, бо ня маюць яны права так звацца. Афіцэр, наколькі мне зразумела, гэта, як мінімум, чалавек з павагаю да сябе, уласным гонарам. А тут – так – служкі, якія хлусяць у вочы, баяцца быць сфатаграфаванымі, і... "нічога ня ведаюць", маўляў, мы не пры чым – гэта ўсё начальства.

Затое зь якім смакам адзін зь іх распавеў пра хлопца зь гітараю, якога яны не пусьцілі прайсьці да поля, і які, сеўшы прама на дарозе, пачаў сьпяваць. "Мы яго ў аддзел завезьлі!"

- Дык можа ен і сьпяваў па-беларуску? – Задаў пытаньне дрыбінскі вэтэран Мікалай Юркоў.

- Да, по-белорусску, - тут жа адказаў адзін зь пільных "стражаў".

Прысутныя засьмяяліся.

Што наконт начальства, дык Мікалай Федаравіч нагадаў ім, што й на Нрнбергскім працэсе ўсе падсудныя таксама сьцвярждалі, што выконвалі загады.

- Я не разумею, чаму мне не даюць прайсьці па маей беларускай зямлі? – Не ўнімаўся спадар Юркоў, - я гэтага так не пакіну!

- Ды там міна ляжыць, ачапленьне саперы...- завучана тлумачыў міліцыянт.

- Дык што, аж з 1514-га года гэтая міна ляжыць? – Спытаў нехта.

Зноў агульны рогат, але ТЫМ хоць бы што. Убачыўшы дзяўчыну з Полацака, якая ў адкрытую фатаграфавала падзеі, вартаўнікі парадку гераічна кінуліся да яе, затрымалі ды пачалі "сьледчыя дзеянні". Разумелі, напэўна, што хутка надыдзе час, і здымкі тыя могуць стаць небясьпечнымі доказамі.

Дарэчы, дзякуючы знаходлівасьці двох удзельнікаў горацкай групы, якія, рызыкуючы, здолелі абысьці баязьлівыя міліцэйскія забароны на карыстаньне фатакамерамі, нашыя чытачы маюць магчымасьць крыху пабачыць, як там усе адбывалася. Некаторыя здымкі, праўда, рабілася на мабільны тэлефон, таму якасьць – ня вельмі добрая.

Людзей тым часам усе прыбывала й прыбывала. Хто выходзіў з праязжаючых рэйсавых аўтобусаў, іньшых падвозілі папуткі. Бачачы бэсэнсоўнасьць супрацьстаяньня, прысутныя прама на прыпынку зладзілі кола, ў цэнтры

якога апынуўся горацкі гісторык, кандыдат навук Аляксандар Каданьчык. Нячаста выкладчыкам даводзіцца праводзіць практычныя заняткі па сваім прадмеце ў палявых умовах і нячаста іх слухаюць з такою ўвагаю. Навуковец на працягу каля дзесяці хвілін распавядаў пра падзеі, якія адбыліся на гэтай зямлі напачатку XVI стагодзя.

Нялішнімі аказаліся тут і некалькі дзясяткаў асобнікаў мінулага нумара нашай газэты з артыкулам спадара Каданьчыка пра даўнюю бітву.

Урэшце, большасьць людзей раз'ехалася. Але няхай ня думае ўсялякая нечысьць, нібы ўсе скончылася на яе карысьць. Прыдзе час – пераможам, як нашыя продкі. І будзе гэтая зямля сапраўды беларускай, 8-е верасьня – дзяржаўным сьвятам, а прывіды сыйдуць у ад, дзе ім і месца.

*Эдуард Брокараў*

## СЬВЕДЧАЦЬ УДЗЕЛЬНІКІ ПАДЗЕЯЎ:

АНДРЭЙ ЮРКОЎ:

Значэнне Аршанскай бітвы я пачаў разумець пасьля знаёмства з Польшчай, бо ў нас праўда пра гэту бітву заўсёды была за сям'ю пячаткамі, а спробы прыадчыніць для простага чалавека завесу таямніцы дэмакратычнай грамадзкасьцю, заўжды патыкалася на мур дзяржаўнай ідэялёгіі. У Варшаве ёсць "Музэй нарадовы", дзе знаходзіцца карціна "Аршанская бітва". Ураджвае любога, паверце, чалавека. Увогуле, у Эўропе гэтую бітву ў шэрагу з Грунвальдзкай, лічаць самай значнай у гісторыі абароны сваіх зямель славянамі. І тое што ў суботу мы пабачылі пад Воршай, той жах уладаў, ад таго, што людзі ў Белорусі перестаюць быць бязвольнымі рабамі, якім дастаткова чаркі і шкваркі, а зноў хочуць "людзьмі звацца", шчыра радуе. Сёлета нас там было сотні і трэба працаваць, каб у наступным годзе прыйшлі тысячы. І нічога нам не зробяць, а будзе сапраўднае сьвята годных сыноў і дачок Бацькаўшчыны.

ІРЫНА КАРАЛЬКОВА:

Абыходзіліся з намі ў аддзеле карэктна, на людзей ня ціснулі, толькі пыталіся ўвесь час, навошта мы туды ехалі. Мне дзіўна, што супрацоўнікі міліцыі да такой ступені ня ведаюць гісторыі сваей краіны. Быў час – яны ў гэты дзень Прысягу прымалі. Я ім шмат пра тое распавядала.

# Жертвы "школы коммунизма"*

На днях довелось увидеть довольно интересную статистику: с 2002-го года цены в Беларуси выросли в 2,3 раза, а курс доллара – повысился только на 36%. Это означает, что рост заработков в долларах может и близко не покрыть инфляцию (рост цен) в рублях. Также интересными мне показались рассуждения в одной из центральных "чэсных" газет насчет того, как живет "обычная" семья из трех человек, где оба взрослых работают на средний заработок (650тыс.+ 650тыс.=1300000 в месяц). И получилось, что семья сумеет сберечь за месяц аж 100000 рублей! Далее "чэсныя" газетчики рассуждают, куда вложить эти деньги: положить в банк, отложить на компьютер или велосипед сыну, сходить в ресторан...

Богатеи, ничего не скажешь, но пусть бы наши районные статистики вместо надоевших передовиц в "Ленинском шляхе", или "Советской веске", а в последнее время – и в "Региональных ведомостях" о надоях и росте ВВП дали данные о том, на какие деньги живет средняя горецкая, или дрибинская семья: у стольких процентов – такой доход, у стольких – такой… Но этого не будет, поскольку картина получится весьма неприглядной и такую информацию власти стараются прятать от нас, уважаемые обыватели, подальше, как от греха, за ширмами различных гостайн.

В принципе, ни один наниматель не стремится платить своим работникам слишком много. Поскольку у нас этим нанимателем является государство, то и ведет она себя подобно какому-нибудь кровососу из недр капитализма. Вспомните, уважаемые обыватели, сколько "весили" сто долларов пять лет назад и сколько они "весят" сегодня. Можно много рассуждать на эту тему, но ощущение основной массы моих друзей и знакомых такое: раньше благосостояние хоть понемногу, да росло. А вот в последние 2-3 года рост доходов словно уперся в невидимую стену и единственная возможность свести концы с концами – поездки на работу за границу.

Когда же начинаю расспрашивать людей, кто по их мнению виновен в такой ситуации, слышу ответ: известно – начальство. Ну, хорошо – не знает пока наш простой человек, что существуют другие экономические и политические системы и потому – сколько не улучшает начальство старую советскую, пользы не будет. Но почему тогда мы не пробуем отстаивать свои права и интересы хотя бы перед начальством? Виной всему, очевидно, страх. Почти столетие всех, кто шел против течения, вырезали под корень. А посему желающих практически не осталось. Похожей на нашу была ситуация в Европе 100-150 лет тому назад. Но понемногу люди начали объединяться в разные организации (профсоюзы, например) и бороться за свои права. Многотысячные забастовки, голодовки, самоотверженность лидеров профсоюзного движения со временем заставили нанимателей сесть за стол переговоров и с расчетами в руках договариваться об уровне заработков, а фактически – о разделе прибылей.

И только после этого народ получил достойную жизнь, поскольку знал, сколько есть денег на предприятиях и реально обрел возможность участвовать в определении направлений развития экономики. У нас же все по-старому. Простой люд и близко не знает, какими средствами "ворочает" предприятие, а точнее – начальство. Профсоюзные лидеры сидят тихонько на "теплых" местах и даже не интересуются реальным уровнем жизни трудящихся. А сами трудящиеся, получив в конце месяца жменьку "зайчиков", не знают, что делать, поскольку на "чарку и шкварку" хватает и бузить, вроде бы и не с чего, а достойной, полнокровной жизни тут не было никогда, потому в нее уже и не верится, хоть лопни. А без понимания другого жизненного уклада и веры в победу справедливости бороться за лучшую долю никто не станет.

Поэтому, учитесь, уважаемые обыватели, читайте не только "правильные" газеты, но и те, что властям не нравятся. Присоединяйтесь к независимым профсоюзам, участвуйте в негосударственных образовательных программах, и тогда вместе мы изменим наш край к лучшему.

*Андрей Юрков,*
*г.п. Дрибин, тел. 623 61 08*

* "Школой коммунизма" в советские времена официальная пропаганда называла профсоюзы.

№11 ВЕРАСЕНЬ 2007 Выбар
Газета Магілёўскай абласной кааліцыі дэмакратычных сілаў

# Дзень ведаў

Незаўважна праляцела лета і ў першы дзень восені шматлікім вучням розных навучальных устаноў нашай краіны прыйшла пара сядаць за парты і пачынаць “грызці граніт навукі”. Усяго 1 верасня села за парты ў нашай роднай Беларусі каля 2,2 мільёнаў навучэнцаў школ, вучылішчаў, ВНУ і ССНУ. А калі падлічыць яшчэ родных і блізкіх гэтых навучэнцаў, дык наогул атрымаецца, што больш за палову насельніцтва Рэспублікі Беларусь святкавалі 1верасня Дзень ведаў.

Урачыстая лінейка адбылася ў гэты дзень і ў Машчаніцкай сярэдняй школе Бялыніцкага раёна. Святочна апранутыя школьнікі, іх бацькі, настаўнікі сабраліся на пляцы перад школай, каб адзначыць пачатак навучальнага года. Начальнік аддзела адукацыі Мікалай Іванавіч Пашкоўскі прадставіў педагогам і навучэнцам новага дырэктара школы, Андрэя Аляксандравіча Ганчука, расказаў аб поспехах у справе адукацыі ў нашым раёне і пажадаў поспехаў у новым навучальным годзе. Наогул, выступ быў добры і цікавы, толькі не зразумела, чаму ў школе з беларускай мовай навучання ён прагучаў па рускі, дарэчы як і выступы ўсіх астатніх педагогаў і школьнікаў. Я добра памятаю, якім руплівым беларушчыны быў шаноўны Мікалай Іванавіч у пачатку 90-х гадоў, калі ўзначальваў 1-ю школу г. п. Бялынічы. Гэта тым больш сумна, што ўрачыстая лінейка адбывалася напярэдадні Дня беларускай пісьменнасці і культуры, што адзначаўся 2 верасня па ўсёй нашай краіне, а цэнтр святочных мерапрыемстваў быў на тэрыторыі нашай вобласці ў Шклове. Дарэчы, у Шклове ў гэты дзень па прыкладзе губернатара Барыса Батуры ўсе выступоўцы рабілі выступы толькі на беларускай мове. У Машчаніцы ж па беларуску выступіў толькі прадстаўнік бацькоў Барыс Вырвіч, які ў сваёй прамове пажадаў вучням і настаўнікам святочнага настрою, добрага здароўя, выдатных ведаў (а настаўнікам яшчэ і важкіх заробкаў).

Пасля лінейкі ва ўсіх класах адбыўся ўрок, прысвечаны класікам беларускай літаратуры Янку Купалу і Якубу Коласу. Асабіста я прысутнічаў на уроку, які праводзілі з вучнямі малодшых класаў Наталля Аляксандраўна Жыгера і Галіна Віктараўна Самковіч. Ад працы гэтых настаўнікаў, іх найцікавейшага выкладання матэр’яла пра нашых песняроў (у гэтым годзе, дарэчы, адзначаецца 125 годдзе з дня іх нараджэння), засталіся самыя прыемныя ўражанні.

Ну а напрыканцы крыху аб сумным. У гэтым годзе вучыцца ў Машчаніцкай школе будзе толькі 88 вучняў, з іх у 11 класе – 6, ў першым – 5. І гэта ў адным з буйнейшых аграгарадкоў Бялыніцкага раёна, у развіццё якога ўкладзена “мора” грошы. Дык пра якое прыярытэтнае развіццё вёскі можна гаварыць? Калі я ішоў вучыцца ў першы клас Машчаніцкай школы 34 гады таму, на лінейцы 31 жніўня стаяла больш за 560 вучняў…На жаль, вёска працягвае старэць і выміраць.

*Іван Барысаў*

# Газеце “Паходня” – 14 гадоў

Здаецца, гэта было не так даўно, а ужо мінула 14 гадоў з дня выхада першага нумара газеты дэмакратычных арганізацый Бялыніцкага раёна “Паходня”. 1 верасня 1993 года, калі на Беларусі былі ўсе ўмовы для развіцця свабоднай прэсы, быў зроблены макет пешага нумара газеты, а 8 верасня, у Дзень перамогі ў славутай Аршанскай бітве, газета упершыню дайшла да свайго чытача. Першым рэдактарам і выдаўцом газеты быў выдатны беларускі пісьменнік, наш зямляк – бялынічанін Міхась Карпечанка, які ўклаў шмат сіл і талента ў станаўлене газеты. Першыя гады газета выходзіла рэгулярна два разы на месяц, але затым для ўсёй незалежнай прэсы насталі цяжкія часы і газеце “Паходня” давялося прыпыніць выхад. Аднаўляецца выданне газеты 15 лютага 2000года, калі ў раёне пачынаецца працэс кансалідацыі грамадскіх арганізацый дэмакратычнай скіраванасці і пачынае сваю працу Бялыніцкі раённы інфармацыйны цэнтр грамадскіх арганізацый. І зноў напачатку рэдактарам “Паходні” працуе Міхась Карпечанка, а затым яго на гэтай даволі “праблемнай” пасадзе змяняе Генадзь Лапо. Газету ўдаецца некаторы час выдаваць больш – менш рэгулярна, аднак праз некаторы час пасля прэзідэнцкіх выбараў 2001 года нумары сталі выходзіць ўсё радзей і радзей, пакуль з-за недахопу фінансавых сродкаў выдынне газеты зусім не спынілася. Міхась Карпечанка засцярожваецца на працы “Бялыніцкага краязнаўчага таварыства” і выданні газеты мясцовых краязнаўцаў “Бялыніцкая даўніна”, Генадзь Лапо прысвячае сябе мастацкай творчасці.

Зноў атрымалася адрадзіць выпуск “Паходні” ўжо мне, Барысу Вырвічу, у лістападзе 2005 года. Складанасцей было шмат, колькі нерваў парвалі нашы “любімыя” кіраўнікі і “бдительные” супрацоўнікі міліцыі і КДБ… Паверце мне, хапіла ўсяго. Давялося нават прыпыняць выданне газеты на некалькі месяцаў з-за недахопу фінансавых сродкаў (гэта толькі “чэсныя” журналісты складна распавядаюць, як купаюцца ў грашах “проклятые оппозиционеры»). Аднак удалось выстаяць і працягнуць рэгулярны выпуск «Паходні», вось ужо палову года грамадска – палітычнае выданне выходзіць два разы на месяц. І што мяне вельмі радуе як рэдактара, дык гэта тое, што газета знайшла свайго чытача. Рэгулярна тэлефануюць знаёмыя і незнаёмыя людзі, каб


№ 8(20) ПАХОДНЯ
ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ ГАЗЕТА Ліпень2007 г.

**Зарплата высокая, а кадров не хватает**

Заработная плата лейтенанта милиции в Беларуси составляет примерно 750 тысяч белорусских рублей. Генерал милиции получает в 4 -5 раз больше.Об этом сообщил на прессконференции в Минске заместитель министра внутренних дел Беларуси С. Гуреев.

Вместе с тем он добавил, что «очереди на работу в органы внутренних дел нет…Из 10 желающих работать в милиции попадают по состоянию здоровья на службу только трое». Он отметил также, что «многие не выдерживают сложной милицейской работы и уходят из органов внутренних дел», сообщает «Интерфакс».

В Могилёвской области тоже существует дефицит кадров. Особенно сложно с комплектованием кадров в районных центрах. Прав заместитель министра С. Гуреев, не все способны выдержать сложную милицейскую работу. Хорошо, если бы она ограничивалась профилактикой правонарушений, раскрытием преступлений. А то ведь надо производить аресты активистов оппозиции, а затем лжесвидетельствовать в суде, что они «выражались нецензурной бранью и размахивали руками», «отправляли естественные потребности прямо в общественных местах». Надо присутствовать на митингах и пикетах и искать повод для задержания участников протеста против действий властей, разгонять демонстрантов, ходить по квартирам и местам работы коммунистов и требовать у них письменного потверждения их партийности, наличия партбилета с отметкой об уплате членских взносов и др.

Не каждый офицер и сержант милиции может выдержать такую нагрузку, в том числе моральную. Сотрудникам милиции можно только посочувствовать.

*А. Нестерович «Коммунист Могилёвщины»*

P. S.Недавно по приглашению польского профсоюза «Солидарность» довелось побывать в Познани. Посты мэра города и его заместителей занимают уже более 17 лет бывшие активисты оппозиции (люди им доверяют и выбирают уже несколько сроков подряд). Те же сотрудники полиции, которые в своё время рьяно их преследовали и незаконно арестовывали, успели благополучно «отсидеть» за нарушения закона и сейчас добросовестно зарабатывают пенсию дворниками и мойщиками машин.

падзяліцца сваімі меркаваннямі наконт артыкулаў, у Бялынічах сустрэчныя даволі часта просяць новыя нумары газеты. Гэта сведчыць пра тое, што людзям нехапае аб’ектыўнай інфармацыі з незалежных крыніц, яны ўжо не вераць афіцыйнай прэсе, бо тое, пра што пішуць дзяржаўныя газеты, вельмі далёкае ад рэальнага жыцця. І таму «Паходня» будзе выходзіць і далей, як бы цяжка гэта не было калі-небудзь.

*Барыс Вырвіч*

ЧЭРЫКАЎ

## ПРОГНОЗ ЖУРНАЛИСТОВ СБЫВАЕТСЯ?

По неподтверждён ным пока разговорам, якобы с 1 октября текущего года приостанавливает свою деятельность УЧП «Чериковский плодоконсервный завод». Похоже, что прогноз, данный накануне журналистами кричевской "нячэснай" газеты «Вольны Горад», высказанный в прошлом месяце начинает сбываться.

"Чэрыкаўскія навіны"

## САМОЛЕТЫ НАД ЧЕРИКОВОМ

Необычно жаркая погода стояла у нас в середине августа. Всё живое искало тени и прохлады. Всё, но только не неугомонная детвора и её старый, и верный друг — Семён Семёнович Понизовцев. Он и целая ватага местных мальчишек крутили в безоблачном синем небе маленькие юркие самолёты с радиоуправлением. Представление было не хуже того, что не давно показывали на авиационном салоне «МАКС—2007» в Подмосковье. Ребятам очень хочется самим научиться строить и запускать авиамодели. Сегодня очередь из желающих записаться в кружок к Семёну Семёновичу составляет более 30 человек.

Николай ЦАРЬКОВ
"Чэрыкаўскія навіны"

## ПАЦИЕНТЫ СМОГУТ МОЛИТЬСЯ

В местной райбольнице открыта комната для молитв, которую освятил настоятель Свято- Троицкого храма отец Николай. Теперь там можно купить культовые принадлежности для отправления православных обрядов, заказать или прочитать молитву. В установленное время комнату смогут посещать не только пациенты и их родственники, но и все желающие.

Газета «Старый замок», Быхов

# ЕС закрывает энергетический рынок для России

Еврокомиссия планирует принять меры, которые бы ограничили возможности иностранных компаний на европейском энергетическом рынке. Наблюдателям очевидно, что данные предложения направлены, прежде всего, против "Газпрома", однако европейские власти отрицают антироссийскую подоплеку своих действий и заявляют о своей приверженности рыночным принципам.

Еврокомиссия предлагает ограничить некоммерческие инвестиции в европейскую энергетику со стороны неевропейских государственных компаний, а также обязательно следовать так называемому "принципу взаимности". В соответствии с этим принципом ЕС может ввести ограничения для стран, ограничивающих инвестиции компаний из Евросоюза.

Эти меры никоим образом не направлены против России, заявил председатель Еврокомиссии Жозе Мануэл Баррозу. По его словам, речь идет о создании одинаковых условий для инвесторов как в государствах ЕС, так и в "третьих" странах. Цель новых инициатив состоит не в том, чтобы не допустить того, чтобы компании третьих стран играли большую роль на европейском энергетическом рынке, а чтобы обеспечить следование ими одних правил с европейским компаниями. Речь идет о защите справедливой конкуренции, подчеркнул Баррозу.

"Справедливая конкуренция отличается от протекционизма. Если мы хотим обеспечить свободную конкуренцию, мы должны защитить наш внутренний рынок от неконкурентного подхода со стороны зарубежных компаний", - сказал глава Еврокомиссии. Он сказал при этом, что эти компании не должны получит контроль над европейскими энергораспределительными сетями, если не будет соответствующего соглашения между ЕС и заинтересованной в этом "третьей страной". "Мы хотим быть открытыми, но не должны быть наивными", - отметил Баррозу.

В России предложения Еврокомиссии как раз воспринимают как протекционистские и противоречащие тому самому духу свободной конкуренции приверженность которому выражают на Западе. "Речь идет о некой тревоге ЕС, связанной с тем, что страны-поставщики энергоресурсов, обладающие большими финансовыми ресурсами, смогут на корню скупить сбытовые и распределительные сети", - так видит позицию европейских властей глава Российского союза промышленников и предпринимателей Александр Шохин. По его мнению, предлагаемые меры противоречат общему либеральному духу Евросоюза.

"Это попытка компенсировать неучастие России в Энергетической хартии", - цитирует Шохина РИА Новости. Он напомнил, что Россия подписала, но не ратифицировала хартию.

Энергохартия, подписанная в 1991 году в Гааге, задумывалась как механизм сотрудничества между Западной и Восточной Европой по энергетическим вопросам. В январе 2000 года стартовали переговоры о подписании протокола к хартии по транзиту, однако в конце 2003 года они были прекращены.

Сопредседатель Совета по национальной стратегии Иосиф Дискин рассказал Вестям.Ru, что Еврокомиссия давно и последовательно выступает за либерализацию энергетического рынка, указывая на успешный, с ее точки зрения, пример Великобритании и североевропейских стран. Но в условиях либерализации рынка резко возрастает значимость распределительных сетей и еврobюрократы озабочены тем, чтобы они не попали в руки неевропейских игроков. "Газпром", по их мнению, может быть допущен европейский рынок только в том случае, если будет разделен на добывающую и транспортную компании.

Политолог считает, что предложения Еврокомиссии носят откровенно антироссийский характер. Ситуация с энергетикой в Европе и без того напряженная, считает политолог, чтобы создавать дополнительные барьеры, которые могут повернуть "Газпром" в сторону американского рынка.

Заместитель генерального директора Центра политической конъюнктуры Александр Шатилов сообщил Вестям.Ru, что "Газпром" вполне может обойти ограничения ЕС на национальном уровне. Это касается тех стран Центральной и Южной Европы, правительства которых настроены прагматично. Так Болгария и Греция, Сербия активно сотрудничают с Россией в строительстве газопроводов. "Внутри ЕС существует масса противоречий, так что, скорее всего, будет найден способ нивелировать данное решение Еврокомиссии", - заключил эксперт.

Вести.Ru

№11 ВЕРАСЕНЬ 2007 Выбар
Газэта Магілёўскай абласной кааліцыі дэмакратычных сілаў

**"ОХ, ЭТИ РУССКИЕ!"**
*( Группа "Бони-М", "Распутин" – хит 80-х годов)*

КАК ВЫ УЖЕ ПОНЯЛИ, ЭТОТ НОМЕР ГАЗЕТЫ БОЛЬШЕЙ ЧАСТЬЮ ПОСВЯЩЕН РОССИИ. ХОТИМ МЫ ЭТОГО, ИЛИ НЕТ, НО СОСЕДСТВО С ЭТИМ СЫРЬЕВЫМ ПРИДАТКОМ ЕВРОПЫ, НА ПРОТЯЖЕНИИ ВСЕЙ СВОЕЙ ИСТОРИИ ВОЮЮЩИМ НЕ ТОЛЬКО С СОСЕДЯМИ, НО И С СОБСТВЕННЫМИ ГРАЖДАНАМИ, И ПРИ ЭТОМ ПОЧЕМУ-ТО ИЗО ВСЕХ СИЛ СТАРАЮЩИМСЯ ИЗОБРАЗИТЬ ИЗ СЕБЯ "ДЕМОКРАТИЧЕСКУЮ ВЕЛИКУЮ ДЕРЖАВУ", ДЕЛАЕТ ПОСТУПАЮЩУЮ ОТТУДА ИНФОРМАЦИЮ ИНТЕРЕСНОЙ ДЛЯ БЕЛОРУССКОГО ЧИТАТЕЛЯ. ИДЕТ ЛИ РЕЧЬ ОБ "СОВМЕСТНОЙ" ИСТОРИИ, ИЛИ О СОВРЕМЕННЫХ СОБЫТИЯХ, НАШИ ВОСТОЧНЫЕ СОСЕДИ НЕ ДАЮТ ОСТАВАТЬСЯ БЕЗ РАБОТЫ НИ ЖУРНАЛИСТАМ, НИ ИСТОРИКАМ.
НА ЭТОЙ ПОЛОСЕ РАЗМЕЩЕНЫ МАТЕРИАЛЫ, ПОСТУПИВШИЕ В ТЕЧЕНИЕ МЕНЕЕ ЧЕМ ОДНИХ СУТОК ИЗ РАЗНЫХ **РОССИЙСКИХ** ИСТОЧНИКОВ. ПОДЧЕРКИВАЮ СПЕЦИАЛЬНО ДЛЯ ТЕХ, КТО ХОТЕЛ БЫ УСМОТРЕТЬ В НАШЕЙ ГАЗЕТЕ АНТИРОССИЙСКУЮ НАПРАВЛЕННОСТЬ. ЭТО НЕ МЫ – ЭТО САМИ РУССКИЕ ТАК ПРО СЕБЯ ЖЕ И ПИШУТ.

*Редактор*

## ОФИЦЕР ФСБ ЗАДЕРЖАН ЗА ВЗЯТКУ В 1 МЛН

19.09.2007
В Москве задержан офицер ФСБ, подозреваемый в получении взятки в размере миллиона евро, сообщил РИА Новости в среду источник в следственных органах.

"Прикомандированный к Счетной палате офицер ФСБ подозревается в совершении преступления по части 4 статьи 290 УК РФ (получение взятки в крупном размере)", - сказал собеседник агентства.

*www.rian.ru*

## В НАЗРАНИ ОМОН АВТОМАТАМИ РАЗГОНЯЕТ МИТИНГ

19.09.2007
В столице Ингушетии Назрани проходит митинг местных жителей, протестующих против похищений людей. Собравшиеся на Чеченской улице 400 человек обвиняют в похищениях местные спецслужбы.

Сотрудники правоохранительных органов пытаются разогнать толпу, стреляя поверх голов собравшихся и под ноги из автоматов. Об этом по телефону сообщил корреспондент "Газеты.Ru". На улице слышна стрельба из атоматов - как сообщил корреспондент, начался третий "штурм", проводимый спецподразделениями.

Толпа расходиться не собирается, в милицию летят камни.

*Газета.ru*

## РОССИИ НЕ ВЕРНУТ УКРАДЕННЫЕ МИЛЛИАРДЫ

19.09.2007
У России украли примерно 200 миллиардов долларов, сказал заместитель постоянного представителя России в ООН Илья Рогачев в интервью РИА Новости.

Вчера Всемирный банк и ООН предложили план под названием "Возвращение украденных активов", напоминает НТВ. Он поможет государствам вернуть деньги, которые коррумпированные политики украли у них и вывезли за рубеж.

Но России получить свои 200 миллиардов долларов будет непросто. Во-первых, как признал сам Рогачев, российские законы нужно еще приводить в соответствие с европейскими.

А во-вторых, глава Всемирного банка Роберт Зеллик однозначно намекнул, что программа рассчитана скорее на бедные страны, а не на Россию.

*НТВ*

## В РОССИИ НЕ СОЗДАНА СИСТЕМА МОНИТОРИНГА ЗА ПОБОЧНЫМИ ЭФФЕКТАМИ ЛЕКАРСТВЕННЫХ ПРЕПАРАТОВ

20.09.2007.
Это негативно сказывается на обеспечении их безопасности для пациентов, говорится в документах Росздравнадзора, распространенных накануне на коллегии ведомства.

"Фрагментарно поступающая информация по вопросам безопасности лекарственных средств касается только тех препаратов, которые применяются за рубежом, а следовательно вне поля действия системы фармаконадзора России остается весь спектр отечественных препаратов, доля которых на рынке превышает 64%", - говорится в материалах.

Росздравнадзор отмечает, что данных клинических исследований бывает недостаточно, чтобы оценить безопасность препарата.

"Серьезные и редкие нежелательные реакции многих медикаментов, внедряемых в клиническую практику, выявляют только после их широкого применения", - говорится в документах.

Вместе с тем, по словам и.о. генерального директора Научного центра экспертизы средств медицинского применения Сергея Буданова, ежегодно в его учреждение поступают только 400 обращений от врачей по поводу тех или иных отрицательных реакций у пациентов на препараты. Между тем, такая информация позволила бы принять меры, например, по изъятию конкретного лекарства из торгового оборота, что, возможно, спасло бы чьи-то жизни.

*РИА Новости*

№11 ВЕРАСЕНЬ 2007 Выбар
Газэта Магілёўскай абласной кааліцыі дэмакратычных сілаў
Магілеўская абласная газэта. Выдавец: Магілеўская абласная кааліцыя дэмакратычных сілаў.

Галоўны радактар: Эдуард Брокараў, тэл. 545 89 83, электронная адрэса: brok61@yandex.ru
Наклад: 299 асобнікаў, фармат А4, 8 палос.
Падчас выданьня ужываюцца: беларуская (тарашкевіца), беларуская (наркомаўка) ды расейская мовы. Матар'ялы друкуюцца на мове аўтара. Палітычная й моўная цэнзура адсутнічае. Вітаюцца мастацкія творы, а таксама – журналісцкія матар'ялы на беларускай мове. Погляды аўтараў могуць не супадаць з пазыцыяй радакцыі. Радакцыя самастойна прымае рашэньні аб мэтазгоднасьці ўступлення ў перапіску, а таксама аб разьмяшчэньні бясплатнай сацыяльнай раклямы